# #ВЫСТАВА



***На выставе прадстаўлены лепшыя работы выпускнікоў ДМШ імя І. Ф. Хруцкага***

**Да 12 сакавіка ў арт-прасторы навуковай бібліятэкі ПДУ працуе выстава «Нацюрморт: дыялог тэхнік». Яе аўтары – навучэнцы Дзіцячай мастацкай школы ім. І. Ф. Хруцкага.**





Работы выканы ў розных тэхніках і манерах, але прысвечаны аднаму жанру – нацюрморту. Гэта невыпадкова: выстава прымеркавана да дня нараджэння знакамітага майстра пэндзля Івана Хруцкага, чые карціны з вытанчанымі выявамі садавіны, гародніны, птушак з'яўляюцца эталонам рэалістычнай школы жывапісу.

Асаблівы настрой урачыстаму адкрыццю надалі выступленні піяністак з ДШМ №1 Ірыны Гайрыян і Веранікі Грынкевіч. Гледачы атрымалі сапраўднае задавальненне ад сустрэчы з сусветам мастацтва. Шмат цёплых слоў у адрас юных жывапісцаў прагучала ад дырэктара ДМШ ім. І. Ф. Хруцкага Аксаны Тарасікавай, загадчыка навуковай бібліятэкай Марыны Шуханковай і загадчыка кафедрай «Архітэктура і дызайн» ПДУ Алены Крэмнёвай.